ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.08.2025 №155

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для II–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення з беларускай мовай навучання і выхавання ;
# для II–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» (далей – вучэбная праграма) прызначана для II–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення з беларускай мовай навучання і выхавання; для II–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні і распрацавана на аснове вучэбных праграм па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для II–IV класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана:

II клас – на 102 гадзіны для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення (3 гадзіны на тыдзень), з іх 87 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 13 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання / на 102 гадзіны для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (3 гадзіны на тыдзень), з іх 87 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 13 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання;

III клас – на 136 гадзін для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення (4 гадзіны на тыдзень), з іх 109 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 25 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання / на 68 гадзін для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (2 гадзіны на тыдзень), з іх 60 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 6 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання;

IV клас – на 175 гадзін для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення (5 гадзін на тыдзень), з іх 142 гадзіны – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 30 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў / на 70 гадзін для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (2 гадзіны на тыдзень), з іх 57 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 10 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў;

V клас – на 140 гадзін для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення (4 гадзіны на тыдзень), з іх 114 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага

дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 23 гадзіны – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў / на 70 гадзін для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (2 гадзіны на тыдзень), з іх 58 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў.

3. Мэты вучэбнага прадмета:

увядзенне вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні ў свет дзіцячай літаратуры, авалоданне маўленчай і чытацкай дзейнасцю на беларускай мове; азнаямленне з багатым светам беларускай дзіцячай літаратуры як мастацтвам слова, далучэнне да нацыянальных і агульначалавечых духоўных каштоўнасцей падчас чытання і асэнсавання літаратурных твораў;

фарміраванне пісьменнага чытача, які валодае навыкам чытання, культурай маўлення, спосабамі самастойнай работы з тэкстам і дзіцячай кнігай, разумення значэння чытання для паспяховага навучання, будучай дзейнасці, самаадукацыі і самаразвіцця на працягу ўсяго жыцця;

карэкцыя і кампенсацыя парушэнняў маўленчай дзейнасці, развіццё і ўдасканаленне маўленчых і іншых псіхічных працэсаў, развіццё пазнавальнай, камунікатыўнай і рэгулятарнай функцый маўлення ў вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні.

4. Дасягненне гэтых мэт мяркуецца праз рашэнне наступных задач:

фарміраваць цікавасць да кніг і чытання, пашыраць чытацкі кругагляд;

развіваць навыкі свядомага, правільнага, плаўнага чытання па-беларуску і ўніверсальныя вучэбныя дзеянні, якія забяспечваюць паспяховае вывучэнне любога вучэбнага прадмета;

удасканальваць камунікатыўна-маўленчыя ўменні вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні, узбагачаць іх актыўны слоўнікавы запас, развіваць наглядна-вобразнае і слоўна-лагічнае мысленне, увагу і памяць, уменне валодаць граматычнымі сродкамі мовы, а таксама матывацыю да камунікацыі і пазнавальную дзейнасць;

фарміраваць чытацкія ўменні, літаратурныя ўяўленні і веды, неабходныя для ўспрымання літаратуры як мастацтва слова, разумення твораў, вылучэння, збору, тлумачэння інфармацыі ў навукова-пазнавальных і вучэбных тэкстах;

развіваць уяўленні пра аўтараў мастацкіх твораў, іх творчасць;

удасканальваць уменні, звязаныя з літаратурна-творчай дзейнасцю, на аснове вывучаемых твораў;

развіваць эмацыянальную спагадлівасць, уяўленне, крытычнае мысленне і творчую актыўнасць;

фарміраваць уяўленне аб літаратуры як нацыянальнай культурнай спадчыне, выхоўваць грамадзянскія і духоўна-маральныя якасці асобы.

5. Асноўная арганізацыйная форма рэалізацыі дадзенай вучэбнай праграмы – вучэбны занятак (урок). На ўроках літаратурнага чытання пераважае метад жывога слова ў спалучэнні з такімі прыёмамі, як гутарка, пераказ, слоўнае маляванне, апісанне ілюстрацый, чытанне на памяць, выразнае чытанне.

Вядучым метадам фарміравання чытацкіх уменняў з’яўляецца аналіз тэксту літаратурнага твора. Аналіз праводзіцца з выкарыстаннем прыёмаў практычнай работы з тэкстам: акцэнтнае вычытванне ўрыўкаў тэксту з апісаннем учынку героя, карцін прыроды, вобразных слоў і выразаў, слоў – носьбітаў характарыстыкі персанажаў, слоў, якія ўказваюць на пачуцці і настрой; пошук адказаў на пытанні настаўніка; вылучэнне сэнсавых частак, складанне плана.

Для арганізацыі літаратурна-творчай дзейнасці на ўроку выкарыстоўваюцца практычныя метады навучання. Вучням прапануюцца разнастайныя творчыя заданні па змесце прачытанага твора, напрыклад: разыгрыванне дыялогаў, эпізодаў, пастаноўка «жывых карцін» з выкарыстаннем руху, мімікі, жэстаў; чытанне па ролях; літаратурныя гульні; мадэляванне вокладкі кнігі.

На ўроках літаратурнага чытання прымяняецца метад аналізу эмацыянальнага зместу твора з выкарыстаннем адпаведных прыёмаў: чытанне ўслых дыялогаў, эмацыянальна насычаных урыўкаў тэксту; пошук варыянтаў дакладнай перадачы пачуццяў, настрою, стану герояў; узорнае выразнае чытанне настаўніка.

Вядучым метадам работы з дзіцячай кнігай на пазакласным чытанні з’яўляецца метад чытання-разгляду. На ўроках пазакласнага чытання павінны выкарыстоўвацца прыёмы, якія будуць выклікаць зацікаўленасць вучн да самастойнага чытання (выставы дзіцячых кніг у адпаведнасці з узростам, рэклама кнігі, калектыўнае ўзнаўленне прачытанага, разважанні аб змесце прачытанага, героях, пачуццях, абмен уражаннямі). У пазаўрочны час у сістэме пазакласнага чытання павінны практыкавацца літаратурныя ранішнікі, віктарыны, конкурсы чытальнікаў, работа ў «майстэрні па рамонце кніг».

Урокі пазакласнага чытання ў II–V класах з вучнямі з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні рэкамендуецца праводзіць пасля вывучэння асноўных тэм чытання. Урокі, прызначаныя на пазакласнае чытанне, уваходзяць у агульную колькасць гадзін, адведзеных

на вучэбны прадмет. На працягу чарговага адрэзка часу настаўнік кіруе самастойным пазаўрочным чытаннем кніг, газет, часопісаў.

Прыкладны аб’ём кніг для пазакласнага чытання: II клас – 8-25 старонак, III клас – 10-30 старонак, IV клас – 15-35 старонак, V клас – 20-35 старонак (з улікам ілюстрацый).

З мэтай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні выкарыстоўваюцца метады праблемнага навучання, інтэрактыўнасці, гульнявыя і іншыя метады.

Працэс навучання літаратурнаму чытанню рэалізуецца праз франтальную форму работы, якую рэкамендуецца спалучаць з калектыўна-размеркавальнай, групавой, парнай і індывідуальнай. Выбар форм і метадаў навучання і выхавання настаўнік ажыццяўляе самастойна ў адпаведнасці з вучэбнымі задачамі канкрэтнага ўрока літаратурнага чытання і з патрабаваннямі да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, сфармуляванымі ў дадзенай вучэбнай праграме з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

6. Змест вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» прадстаўлены наступнымі структурнымі часткамі: «Літаратурная скарбонка» і «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

Частка «Літаратурная скарбонка» змяшчае апісанне вучэбнага матэрыялу і рэкамендаваны пералік твораў для чытання і вывучэння з указаннем колькасці гадзін на вывучэнне тэм чытання. Рэкамендаваны пералік твораў складаецца з двух спісаў: «Для чытання і вывучэння ў класе» і «Для пазакласнага чытання». Выбар тэкстаў для пазакласнага чытання ажыццяўляе настаўнік у адпаведнасці са спісам «Для пазакласнага чытання». Выбіраюцца 3-4 кнігі, аб’яднаныя адной тэмай ці, напрыклад, жанрам.

У частцы «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў» устаноўлены патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні па літаратурным чытанні ў II–V класах.

7. У дадзенай вучэбнай праграме рэалізуюцца пераемныя сувязі з вусным і ўступным курсамі навучання беларускай мове, праграма арыентуе на ажыццяўленне міжпрадметных сувязей з вучэбнымі прадметамі «Русская литература (литературное чтение)», «Выяўленчае мастацтва», «Музыка» падчас фарміравання ў вучняў паняццяў: «жанр», «мастацкі вобраз», «задумка аўтара», «тэма», «форма», «змест», «рытм», «настрой», «аўтар».

8. За перыяд навучання ў II–V класах у вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні будуць сфарміраваны сацыякультурныя ўменні, прадметныя веды, прадметныя (чытацкія і камунікатыўна-маўленчыя) і метапрадметныя ўменні (універсальныя вучэбныя дзеянні), вопыт літаратурна-творчай і самастойнай чытацкай дзейнасці.

Вучні авалодаюць наступнымі сацыякультурнымі ўменнямі:

усведамленне нацыянальнай прыналежнасці і спасціжэнне культурнай спадчыны краіны падчас чытання дзіцячай літаратуры;

развіццё матываў чытацкай дзейнасці, асабістага сэнсу, рэфлексіі, эстэтычных патрэб і чытацкага густу;

засваенне маральных норм і духоўных каштоўнасцей пры навучанні літаратурнаму чытанню;

выкарыстанне маўленчых сродкаў для вырашэння камунікатыўных і літаратурна-пазнавальных задач;

прынясце розных меркаванняў, якія неабходны для разумення свету, сябе і іншых людзей.

Вучні набудуць такія навыкі чытання, як:

чытанне цэлымі словамі і спалучэннямі слоў у тэмпе, набліжаным да хуткасці размоўнага маўлення вучняў;

правільнае чытанне з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай літаратурнай мовы;

чытанне ўслых і сам сабе (моўчкі), азнаямляльнае чытанне, праглядавае чытанне, пошукавае чытанне, выбарачнае чытанне, чытанне па ролях, выразнае чытанне;

выразнае чытанне з пункту гледжання правільнага, асэнсаванага і эмацыянальнага чытання мастацкага твора; самастойнае вызначэнне задачы выразнага чытання.

У гэты ж час вучні засвояць універсальныя вучэбныя дзеянні. Вучні навучацца:

вылучаць ключавыя (апорныя) словы ў тэксце;

вызначаць вучэбную задачу чытання;

кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і яе вынікам;

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу пры абмеркаванні матэрыялу;

размяркоўваць ролі ў групе, дамаўляцца і выконваць правілы ўзаемадзеяння ў групе, пары;

паважліва ставіцца да іншага меркавання.

Віды дзейнасці: слуханне, чытанне ўслых, чытанне сам сабе (моўчкі), азнаямляльнае чытанне, пошукавае, праглядавае чытанне дзіцячай перыёдыкі, пошукавае чытанне даведачнай літаратуры, выбарачнае

чытанне, выразнае чытанне, чытанне па ролях; камбінаванае чытанне (настаўнік – вучні); вылучэнне і чытанне ключавых слоў абзаца, сэнсавай часткі, тэксту; выкананне акцэнталагічных і арфаэпічных практыкаванняў; вызначэнне вучэбнай задачы чытання; планаванне дзейнасці пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразным чытанні, слоўным маляванні, складанне плана, пошук памылак і моцных бакоў у сваім і чужым чытанні; ацэнка чытання з пазіцый правільнасці і выразнасці.

Падчас практычнай работы з тэкстамі мастацкіх і навукова-пазнавальных твораў у вучняў будуць сфарміраваны чытацкія ўменні і адпаведныя ўніверсальныя вучэбныя дзеянні.

Вучні навучацца:

прагназаваць эмацыянальны характар, жанр і змест мастацкага твора па ілюстрацыях і загалоўку;

знаходзіць словы і выразы, якія перашкаджаюць разуменню прачытанага, вызначаць іх значэнне;

устанаўліваць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі;

вызначаць самастойна тэму і асноўную думку твора;

вылучаць дзейных асоб, называць галоўнага героя, вызначаць учынак і прычыну ўчынку; праводзіць аналіз мастацкіх вобразаў і развіцця дзеяння;

знаходзіць у творы апісанне знешнасці героя (партрэт), інтэр'ера памяшкання, карцін прыроды, усведамляць ролю гэтых апісанняў у раскрыцці ўнутранага свету героя;

уяўляць у сваёй свядомасці героя, карціну прыроды і расказваць аб гэтым;

складаць розныя віды характарыстык персанажаў;

узнаўляць «дэфармаваны» паэтычны тэкст;

вызначаць агульны эмацыянальны настрой паэтычнага твора;

валодаць прыёмамі завучвання вершаў;

назіраць за будовай эпічнага твора, вызначаць яго структурныя часткі;

самастойна складаць план твора і карыстацца ім падчас пераказу;

падрабязна, сцісла або выбарачна пераказваць сюжэт твора ці яго эпізод з выкарыстаннем розных тыпаў маўлення і з улікам жанравай асаблівасці твора (самастойна або з дапамогай настаўніка);

рабіць стылістычны аналіз мастацкага твора (з дапамогай настаўніка);

адрозніваць і называць фальклорныя жанры і жанры аўтарскай літаратуры, вылучаць іх жанравыя асаблівасці;

адрозніваць мастацкія і навукова-пазнавальныя літаратурныя творы, якія па-рознаму адлюстроўваюць свет;

працаваць з навукова-пазнавальнымі тэкстамі: вылучаць фактычны матэрыял, складаць план (з дапамогай настаўніка), сістэматызаваць і ацэньваць інфармацыю з пункту гледжання яе выкарыстання;

ствараць маналагічнае выказванне на зададзеную тэму;

працаваць з табліцамі і схемамі;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу па пытаннях вывучаемай тэмы;

правяраць вынікі сваёй работы па прапанаваным узоры (крытэрыях);

параўноўваць творы розных відаў мастацтва (фальклору, літаратуры, жывапісу, музыкі);

дэманстраваць начытанасць і сфарміраванасць спецыяльных чытацкіх уменняў;

рабіць выставы кніг на прапанаваную тэму;

шукаць у даведачнай літаратуры дадатковую інфармацыю.

У працэсе чытання і аналізу канкрэтных твораў у вучняў будуць сфарміраваны такія літаратуразнаўчыя ўяўленні, як:

мастацкі твор: празаічны, паэтычны;

фальклор, вусная народная творчасць, жанравыя асаблівасці твораў фальклору;

аўтар (празаік, паэт); жанравыя асаблівасці твораў аўтарскай літаратуры;

загаловак, назва твора, герой, персанаж твора; тэма, галоўная думка твора; будова твора: сэнсавыя часткі, карціны, іх узаемасувязь;

асаблівасці розных жанраў літаратуры і іх адметныя рысы;

арыенціроўка ў пэўных літаратурных тэрмінах.

Віды дзейнасці: назіранне за формай паэтычнага і празаічнага тэксту твора, яго будовай (мастацкай формай структуры тэксту, мовай твора, сродкамі мастацкай выразнасці); уяўленне ў думках вобразаў мастацкага твора: паэтычных карцін прыроды, герояў, падзей; аналітычная і ацэначная работа з тэкстам твора (тэкставы аналіз), складанне выказванняў параўнальнага, ацэначнага характару, высноў; параўнанне мастацкіх тэкстаў розных жанраў і герояў, вылучэнне жанравых прымет, пошук выяўленча-вобразных сродкаў мастацкага маўлення.

У час выканання разнастайных заданняў творчага характару ў сувязі з прачытаным творам вучні авалодаюць рознымі відамі самастойнай літаратурна-творчай дзейнасці, напрыклад:

ілюстраванне зместу твора, вуснае і слоўнае маляванне;

калектыўнае сачыненне невялікіх твораў розных літаратурных жанраў;

пераказ зместу твора (падрабязны, сціслы, выбарачны, творчы);

выразнае чытанне па ролях;

інсцэніроўка эпізодаў, нескладаных сюжэтных твораў (казка, апавяданне) або асобных эпізодаў (з рэплікамі, мімікай і рухамі, пастаноўка «жывых карцін»);

«інтэрв'ю» з персанажам, які спадабаўся; рэпартаж з месца падзей;

стварэнне сціслага водгуку аб самастойна прачытаным творы па дадзеным узоры (з дапамогай настаўніка);

падрыхтоўка творчага праекта на зададзеную тэму (з дапамогай настаўніка);

стварэнне дзённіка летняга чытання;

конкурснае чытанне вывучаных вершаў.

На ўроках пазакласнага чытання вучні навучацца:

арыентавацца ў групе кніг да пачатку чытання;

засвойваць сувязі: кніга – тэма, кніга – аўтар, кніга – жанр;

адрозніваць кнігі па жанрах;

адрозніваць асноўныя элементы кнігі;

выбіраць кнігі для чытання ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай, карыстаючыся рознымі відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі;

вызначаць прыкладны змест новай кнігі па інфармацыі на вокладцы, тытульным лісце, па ілюстрацыях;

самастойна асэнсоўваць прачытанае;

арыентавацца ў структуры дзіцячай кнігі-даведніка, энцыклапедыі;

звяртацца да даведачнай літаратуры з мэтай адбору неабходнай інфармацыі да ўрока, выступлення;

разглядаць і чытаць дзіцячыя часопісы і газеты;

працаваць у бібліятэцы (школьнай, раённай), карыстацца паслугамі чытальнай залы.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў II КЛАСЕ

(102 гадзіны, з іх 87 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 13 гадзін – на пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання /102 гадзіны, з іх 87 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 13 гадзін – на пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання)

### ЛІТАРАТУРНАЯ СКАРБОНКА
### Восень шыла сарафан

(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы аб восеньскіх зменах і прыгажосці прыроды ў гэты час, аб дарах восені.

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Чарняўскі. «Звініць званок».
А. Дзеружынскі. «Мой клас».
В. Жуковіч. «Свята ў будзень».
А. Дзеружынскі. «Верасень».
В. Сухамлінскі. «Чаму Волечка не сарвала кветку?».
Я. Жабко. «Залатая казка», «Восень вераснёвая».
М. Даніленка. «Восень шыла сарафан».
Н. Галіноўская. «На прагулцы».

Для пазакласнага чытання

Клаўдзія Каліна. «Кастрычнік».
С. Новік-Пяюн. «Восень залатая».
А. Дзеружынскі. «Кастрычнік».
В. Хомчанка. «Цёплы грыб».

### Жывое слова

(20 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 20 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Творы вуснай народнай творчасці: малыя жанры (забаўлянкі, загадкі, скорагаворкі, прыказкі, прымаўкі, жарты і смяшынкі, лічылкі, калыханкі, народныя песні), народныя і аўтарскія казкі з жартоўным, забаўляльным і павучальным зместам.

Для чытання і вывучэння ў класе

Забаўлянкі:
«Ладу, ладу, ладкі».
«У куце сядзіць мядзведзь».
У. Бабкоў. «Які ты, кот?».
В. Вітка. «Коця і Каця».
Загадкі.
Скорагаворкі.
Прыказкі і прымаўкі.
Жарты і смяшынкі.
Лічылкі:
«Раз, два, тры, чатыры…».
«Раз, два, тры, чатыры, пяць…».
В. Вітка. «Раз, два, тры, чатыры…».
«Ішла кукушка міма сеці...».
Калыханкі:
«Люлі-люлі, люляшу…».
«А ты, коцінька-каток…».
«Баю, баіньку, баю…».
«Калыханка».
Беларускія народныя песні:
«Бяроза з лістком» (урывак).
«Чаму ж мне не пець».
Казкі:
«Коцік Петрык і Мышка» (беларуская народная казка).
«Вол і асёл» (беларуская народная казка).
«Пра зайчыка і вавёрку» (беларуская народная казка).
Апавяданні:
Васіль Хомчанка. «Білеты ў цырк».
Васіль Хомчанка. «Яшава рукавічка».

Для пазакласнага чытання

«Муха-пяюха» (беларуская народная казка).
«Каток – залаты лабок» (беларуская народная казка).
«Курачка-рабка» (беларуская народная казка).
«Курачка-рабка» (руская народная казка).
«Сынок з кулачок» (беларуская народная казка).

Мама, тата, я – дружная сям’я

(18 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 18 гадзін,

з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне)

Творы пра сям’ю і ўзаемаадносіны паміж яе членамі, пра абавязкі членаў сям’і і клопат аднаго аб адным, пра святочныя і паўсядзённыя справы сямейнага жыцця.

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Пазнякоў. «Плыве ў блакіце белы бусел…».
Вера Вярба. «Матуліны рукі».
В. Хомчанка. «Яблык».
Б. Сачанка. «Настачка».
К. Ушынскі. «Гусі».
В. Хомчанка. «Гузік».
Т. Кляшторная. «Ветлівыя словы».
Максім Танк. «Хлеб».
В. Асеева. «Чарадзейныя словы».
Клаўдзія Каліна. «Кампот».
А. Барто. «Памочніца».
У. Юрэвіч. «Бярозчыны валёнкі».

Для пазакласнага чытання

Ніл Гілевіч. «Мама».
Б. Сачанка. «Бабка Адарка».
А. Мімрык. «Жывы голас».
В. Сухамлінскі. «Цяпер я ведаю, якая Беларусь».
М. Пазнякоў. «Літары», «Расчашу сонца», «Памочніца».

Зімовыя прыгоды
(10 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 10 гадзін,
з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне)

Творы пра прыгажосць зімовай прыроды, зімовыя забавы дзяцей, працу і адпачынак, зімовыя святы.

Для чытання і вывучэння ў класе

Янка Журба. «Першыя сняжынкі», «Дзед Мароз».
П. Броўка. «Зіма».
В. Хомчанка. «Снег».
Якуб Колас. «Зіма».
Клаўдзія Каліна. «Зімовы Дуб».
Н. Галіноўская. «Размова сняжынак».
А. Кобец-Філімонава. «Мароз, Чырвоны нос».
Т. Бушко. «Сняжынка».

Васіль Вітка. «Сяброўкі».

Для пазакласнага чытання

М. Даніленка. «Як Петрык мароз напалохаў».
В. Сухамлінскі. «Вераб'і плачуць ад холаду».
А. Кобец-Філімонава. «Дзівосны лядзяш».
П. Рунец. «Як Сцёпка ўцёк ад марозу».
Ф. Рамашка. «Званочкі на рабіне».

Я і мае сябры
(9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне / 9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы аб сябрах і сяброўстве, маральных якасцях сапраўднага сябра і клапатлівага чалавека.

Для чытання і вывучэння ў класе

Я. Бяганская. «Аленчыны канькі».
В. Сухамлінскі. «Як Андрэйка перанёс Ніну».
Вера Вярба. «Мае малюнкі».
Я. Бяганская. «Сябры».
В. Хомчанка. «Наша лавачка».
Л. Талстой. «Два таварышы».
П. Макаль. «Пакліч у госці сонца».

Для пазакласнага чытання

В. Жуковіч. «Хто вінаваты», «Не ўмею, паспею».
М. Лук. «Выпадак з марожаным».
У. Немізанскі. «Два Васі».
М. Маляўка. «Лыжнік».

Вясенняя старонка
(9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне / 9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра вясну, змены ў прыродзе, якія адбываюцца з надыходам вясны, а таксама пра клопат аб братах нашых меншых.

Для чытання і вывучэння ў класе

П. Саковіч. «Коцікі».
Клаўдзія Каліна. «Фіялка».
Якуб Колас. «Прылёт птушак».
Вера Вярба. «Пралеска».

А. Дзеружынскі. «Бусел і хлопчык», «Птушыны спеў».
Васіль Вітка. «Вясна», «Сонейку».

Для пазакласнага чытання

Клаўдзія Каліна. «Сакавік і яго сёстры», «Красавік».
М. Чарняўскі. «Сакавік».
В. Жуковіч. «Птушыная мова».
П. Ткачоў. «Зямля прачынаецца».

З усмешкай і ўсур’ёз
(20 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 20 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне)

Жартоўныя творы пра дзяцей, цікавыя і гумарыстычныя падзеі, што адбываюцца з людзьмі і жывёламі.

Для чытання і вывучэння ў класе

Р. Барадулін. «Ай! Не буду! Не хачу!»
Эдзі Агняцвет. «Саўка за сталом».
Р. Барадулін. «Адкуль прыходзіць апетыт?».
М. Носаў. «Жывы капялюш».
В. Ткачоў. «Гузак».
Н. Галіноўская. «Выратаваў», «Няўважлівыя лісяняты».
Р. Бензярук. «Клекатунчык».
А. Дзеружынскі. «Памочніца».
І. Муравейка. «Ціма».
Эдзі Агняцвет. «Ледзянцы».
Г. Аўласенка. «Як мухаморы вайну пачыналі».
А. Бачыла. «Колькі кот набіў пасуды».
У. Мазго. «Света з інтэрнэта».
А. Дзеружынскі. «Чыя памылка?».
Т. Кляшторная. «Дапамагу».

Для пазакласнага чытання

А. Дзеружынскі. «Небылічка-смехатунічка».
П. Рунец. «Прапаў апетыт».
П. Макаль. «Хто з’еў слана?».
П. Прануза. «Зямля б перакулілася».

Шчаслівая ўсмешка лета
(9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 9 гадзін,

з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Творы аб характэрных прыкметах лета, летніх зменах у прыродзе і аб летнім адпачынку.

Для чытання і вывучэння ў класе

Н. Галіноўская. «Лета».

П. Броўка. «Замалёўка».

Паводле А. Якімовіча. «Летам у бары».

В. Хомчанка. «Лівень».

І. Муравейка. «Шкадлівы камень», «Колеры года».

Клаўдзія Каліна. «Чэрвень і сонейка», «Жнівень».

А. Дзеружынскі. «Васілёк».

Для пазакласнага чытання

А. Дзеружынскі. «Сонца».

М. Янчанка. «Бярозка».

Я. Бяганская. «Каму сказаць “дзякуй”?».

В. Сухамлінскі. «Дождж і гром».

У. Дубоўка. «Шануйце ўсё жывое».

П. Граніт. «Хмарка».

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

М. Пазнякоў. «Плыве ў блакіце белы бусел…».

Т. Кляшторная. «Ветлівыя словы».

Янка Журба. «Першыя сняжынкі».

П. Броўка. «Зіма».

П. Макаль. «Пакліч у госці сонца».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

Вучні павінны ведаць:

прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх неаднойчы сустракаліся на старонках падручніка, і іх творы (назва, імёны герояў, асноўны змест);

творы, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

правілы карыстання кнігамі.

Мець першапачатковае ўяўленне:

пра творы вуснай народнай творчасці (пацешкі, прыказкі, скорагаворкі, загадкі, казкі);

віды народных песень (калыханка, лірычная песня);

творы аўтарскай літаратуры (апавяданне, верш, казка);

выяўленча-вобразныя сродкі мовы мастацкага твора (параўнанне, адушаўленне нежывой прыроды, эмацыянальна-ацэначныя словы);

сродкі выразнага чытання (сіла голасу, паўза, інтанацыя сказа).

Умець:

слухаць казкі, апавяданні, вершы;

чытаць цэлымі словамі ўслых і ў тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага; артыкуляваць галосныя і зычныя выразна (па магчымасці);

чытаць цэлымі словамі правільна з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай мовы: захоўваць найбольш распаўсюджаныя арфаэпічныя нормы (вымаўленне гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], спалучэнняў [шч], [дз’], [дж], падоўжаных зычных);

выразна чытаць мастацкі твор з захаваннем інтанацыі сказа;

правільна называць прачытаны твор, кнігу (прозвішча аўтара, назва);

арыентавацца ў змесце твора да чытання (па загалоўку і ілюстрацыях, з дапамогай настаўніка);

вылучаць у тэксце незразумелыя словы і выразы, вызначаць іх значэнне праз кантэкст (з дапамогай слоўніка або настаўніка);

з дапамогай настаўніка вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай прачытаць;

складаць вусны адказ на пытанне настаўніка;

знаходзіць у тэксце пачатак і канец урыўка, які праілюстраваны (з дапамогай настаўніка);

вылучаць дзейных асоб твора (самастойна або з дапамогай настаўніка);

знаходзіць у тэксце эпізод з апісаннем учынку героя; выказваць свае адносіны да ўчынку героя (з дапамогай настаўніка);

пераказваць урывак або невялікі твор (апавяданне апавядальнага характару, казку, сюжэтны верш) па пытаннях настаўніка і з апорай на ілюстрацыі;

адрозніваць і называць творы фальклору (скорагаворка, загадка, прыказка, песня, казка);

адрозніваць і прыводзіць прыклады народных песень, загадак, скорагаворак, прыказак, казак, вершаў і апавяданняў з кола вывучаных твораў (самастойна ці з дапамогай настаўніка);

арыентавацца ў кнізе: знаходзіць у змесце прозвішча аўтара, назву патрэбнага твора і адпаведную старонку (самастойна ці з дапамогай настаўніка).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

арыентавацца ў кнізе па яе змесце пад кіраўніцтвам настаўніка;

выказваць ацэначныя погляды аб прачытаным творы (героі, падзеі), кнізе, прагледжаным фільме (самастойна ці з дапамогай настаўніка);

знаходзіць у тлумачальным слоўніку значэнне невядомага слова (самастойна ці з дапамогай настаўніка);

прымаць удзел у літаратурных конкурсах (пад кіраўніцтвам настаўніка).

Карыстацца набытымі ведамі і ўменнямі падчас выканання заданняў творчага характару:

ствараць ілюстрацыі да прачытанага твора, прыдумваць да іх подпісы, рабіць выставы ілюстрацый;

выказваць сваё меркаванне аб прачытаным творы, героі і яго ўчынках, прыводзіць аргументы і доказы, абапіраючыся на змест прачытанага твора (з дапамогай настаўніка);

складаць пытальны план прачытанага твора і пераказваць яго ў адпаведнасці з планам;

складаць апавяданне або казку на пэўную тэму па ілюстрацыях, дадзеным плане і апорных словах, па дадзеным пачатку або канцоўцы;

выразна чытаць па ролях дыялогі літаратурных герояў або эпізоды казкі ці апавядання ў залежнасці ад эмацыянальнага стану героя і эмацыянальнага настрою твора (з дапамогай настаўніка);

інсцэніраваць асобныя эпізоды твора з захаваннем мімікі, жэстаў, моўных асаблівасцей герояў (з дапамогай настаўніка);

удзельнічаць у конкурсных чытаннях вывучаных вершаў.

# ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў III КЛАСЕ

(136 гадзін, з іх 109 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 25 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання / 68 гадзін, з іх 60 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 6 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання)

### ЛІТАРАТУРНАЯ СКАРБОНКА
#### Нас школа вітае

(10 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 6 гадзін, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Творы пра адносіны да вучобы, ролю кніг, важнасць стараннай вучнёўскай працы.

Для чытання і вывучэння ў класе

А. Гурыновіч. «Каток».
В. Жуковіч. «Мае сябры».
Г. Лукашэвіч. «Навука чытання».
М. Пазнякоў. «Першага верасня».
М. Чарняўскі. «Як Мікітка сукенку з’еў».
М. Чарняўскі. «Забаўны рукзачок».

Для пазакласнага чытання

А. Дзеружынскі. «Хто вас у школу сабіраў?».
К. Камейша. «Задача».
І. Муравейка. «Пра мышку і кніжку».
В. Жуковіч. «Жураўліны вырай».
М. Пазнякоў. «Сяргей».
А. Пісьмянкоў. «Саўка ды Грышка».
П. Пранузა. «Піша літару Марына», «Бывай, лета!».
М. Чарняўскі. «Пайшлі ад нас канікулы».

#### Восеньскія гісторыі

(10 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра прыгажосць восеньскай прыроды, змены, якія адбываюцца ў прыродзе восенню.

Для чытання і вывучэння ў класе

В. Жуковіч. «Маладая восень».

Клаўдзія Каліна. «Верасень».
Якуб Колас. «Адлёт жураўлёў», «На ніцях белай павуціны…».
Якуб Колас. «Восень».
Р. Ігнаценка. «Грыбнік».

Для пазакласнага чытання

Г. Аўласенка. «Клён».
Р. Бензярук. «Хто каго перакрычыць?».
Вера Вярба. «Восень».
М. Даніленка. «Па лясах і палях».
Максім Лужанін. «Восень».
М. Чарняўскі. «Павучковыя арэлі».

У свеце ветлівасці і дабрыні
(16 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра стаўленне людзей адзін да аднаго, добрыя і дрэнныя ўчынкі, неабходнасць ветлівасці і добразычлівасці ў жыцці.

Для чытання і вывучэння ў класе

Я. Бяганская. «Каму сказаць “дзякуй”?».
Васіль Вітка. «Чатыры пажаданні».
Алесь Гарун. «Добрыя дзеці».
П. Кавалёў. «Падзяка».
І. Муравейка. «Чаму мяне не хваляць?».
Я. Пархута. «Кропелька».
Максім Танк. «Жук і слімак».
Цётка. «Гутарка асоту з крапівою».

Для пазакласнага чытання

Л. Арабей. «Зернетка і вецер».
Г. Аўласенка. «Сказ пра тое, як Алесік заблукаў аднойчы ў лесе».
Р. Бензярук. «Дружбакі», «Заяц, вожык і ручай», «Чыя моркаўка?».
Р. Бохан. «Добрага ранку».
Н. Галіноўская. «Ветлівы свавольнік».
В. Гурыновіч. «Добрыя суседзі».
А. Жук. «Хто вінаваты?».
В. Жуковіч. «Дзе прывітанне?».
У. Карызна. «Радасць».
Л. Качанка. «Яблычак».
І. Муравейка. «Ціма», «Куплёная груша».
А. Пальчэўскі. «Першая сяброўка».

Я. Пархута. «Птушыны інтэрнат».
П. Прануза. «Добры дзень».
Максім Танк. «Галінка і верабей».
М. Чарняўскі. «Каго баіцца зубр?».
А. Якімовіч. «Вось дык суседзі!».

Падарожжа ў свет казкі
(14 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе
Беларускія народныя казкі:
«Ганарыстая варона».
«Два маразы» (у апрацоўцы Якуба Коласа).
«Коцік, пеўнік і лісіца».
«Пшанічны каласок».
«Як курачка пеўніка ратавала».
Для пазакласнага чытання
«Каза-манюка» (беларуская народная казка).
«Дзедава рукавічка» (беларуская народная казка).
«Казка пра быка і яго сяброў» (беларуская народная казка).
«Камары і мядзведзь» (беларуская народная казка).
«Лісіца і гусак» (беларуская народная казка).
«Не сілай, а розумам» (беларуская народная казка).
«Хітры вол» (беларуская народная казка).

Зімовыя прыгоды
(15 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра зімовыя змены ў прыродзе, працу і адпачынак зімой.

Для чытання і вывучэння ў класе
А. Ставер. «На горцы».
Я. Галубовіч. «Андрэйка-памочнік».
В. Жуковіч. «З гары».
В. Лукша. «За што люблю я Новы год?».
Я. Бяганская. «Пра казачных чалавечкаў».
Ю. Свірка. «З першым снегам!».
П. Ткачоў. «Пад Новы год».

Для пазакласнага чытання

У. Мазго. «Новы год», «Птушыная сталоўка».
Н. Галіноўская. «Лясныя жыхары».
Я. Галубовіч. «Галкі грэюцца».
К. Камейша. «Першы снег».
М. Маляўка. «Белы вярблюд».
І. Муравейка. «Для чаго снягір каляровы?».
М. Пазнякоў. «На горку!», «Зімовыя птушкі».
П. Прыходзька. «Сінічка».
П. Ткачоў. «Мікіткаў падарунак».
В. Хомчанка. «Галка».

Пяшчотны свет сям'і
(18 гадзін, з іх 4 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра ўзаемаадносіны, клопат, павагу ў сям'і.

Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Маме».
Н. Галіноўская. «Бабуліна песня».
Г. Гарбук. «Незнарок і знарок».
В. Жуковіч. «Сям'я».
У. Карызна. «Самая лепшая».
І. Муравейка. «Адно яечка на дваіх».
Я. Радкевіч. «Хто самы моцны?».
Д. Слаўковіч. «Разумны аловак».
П. Ткачоў. «Незвычайны дыктант».

Для пазакласнага чытання

А. Бадак. «Шалік».
Р. Бензярук. «Малінавы чай».
Васіль Вітка. «Дзень нараджэння».
А. Якімовіч. «Што любіць бабуля?».
Н. Галіноўская. «Брат», «Камп'ютаршчык», «Песня для мамы».
А. Грачанікаў. «Цікаўны ўнук».
Я. Жабко. «Самы любы мой дзянёк».
В. Жуковіч. «Свая дапамога».
Т. Кляшторная. «Дзіцячыя мары».
А. Масла. «Зорная казка».
У. Мацвеенка. «Трускалкі».

Н. Мацяш. «Агеньчык».
І. Муравейка. «Бабуля захварэла», «Паўлінчын гарох».
М. Пісьмянкоў. «Бабчыны дранікі».
П. Прануза. «Маміны рукі», «Сам».
П. Сушко. «Зязюля».
В. Хомчанка. «Апельсін», «Мама».

Урокі працавітасці
(15 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін)

Творы пра адносіны да працы, павагу да працавітых людзей, усведамленне неабходнасці стваральнай працы ў штодзённым жыцці людзей.

Для чытання і вывучэння ў класе
Я. Бяганская. «Як Настачка маме дапамагала».
Змітрок Бядуля. «Гаспадарка».
М. Даніленка. «Чароўнае слова».
А. Дзеружынскі. «Хлебная скарынка».
Янка Купала. «Хлопчык і лётчык».
І. Муравейка. «Тры лыжкі».
М. Пазнякоў. «Хлеб».
Н. Парукаў. «Не хапіла работы».

Для пазакласнага чытання
Эдзі Агняцвет. «Хто пачынае новы дзень?».
Г. Аўласенка. «Сказ пра Мураша-лайдака».
Р. Бензярук. «Працавітыя, дружныя».
Васіль Вітка. «Сарочыны блінцы».
Н. Галіноўская. «На лузе».
М. Даніленка. «Заяц Доўгае Вуха».
А. Дзеружынскі. «Той, хто працуе...».
У. Карызна. «Чыстая градка».
П. Прануза. «На градцы».
В. Хомчанка. «Самы лепшы малюнак».

Усмешка вясны
(15 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін)

Творы пра веснавыя змены ў прыродзе, працу і адпачынак вясной.

Для чытання і вывучэння ў класе

Я. Бяганская. «Дзе начавалі рукавічкі?».
Н. Галіноўская. «Вясновая бярозка».
Янка Журба. «Пчолка».
Якуб Колас. «Песня аб вясне».
Н. Маеўская. «Як галінка прачнулася».
У. Мазго. «Сябры вясны».
М. Пазнякоў. «Садзім алею».
Цётка. «Сварба».

Для пазакласнага чытання

Г. Аўласенка. «Аб чым спяваюць птушкі?», «Ганарлівая кветачка».
Я. Галубовіч. «Вожык і Ручаёк», «Бярозавыя ледзянцы».
В. Гарбук. «Кветкі».
А. Дзеружынскі. «Птушыныя напевы».
Клаўдзія Каліна. «Песня вясны».
Якуб Колас. «Раніца вясною».
Т. Кляшторная. «Шпак».
У. Мазго. «Дыктоўка».
М. Маляўка. «Каб вясна хутчэй настала».
І. Муравейка. «Няўжо вясна?».
П. Прануза. «Я вясну малюю».
Міхась Чарот. «Вясенняя раніца».

З любоўю да роднага краю
(13 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра адносіны да Радзімы, хлеба, пра прыродныя сімвалы Беларусі.

Для чытання і вывучэння ў классе

Р. Бензярук. «Шпак і Верабей».
Р. Бохан. «Скарынка».
М. Маляўка. «Радзіма».
Н. Галіноўская. «На плошчы Перамогі».
А. Кобец-Філімонава. «Кропелька».
М. Пазнякоў. «Родная мова».

Для пазакласнага чытання

Р. Бохан. «Хлеб і сонца».
Н. Галіноўская. «Журка-журавель», «Зямля мая».

А. Дзеружынскі. «Беларуская бульба», «Прыляцеў я ў свой край».
В. Жуковіч. «Незаменнае».
М. Калачынскі. «Размова з жураўлём».
М. Пазнякоў. «Скарб».

Малюнкі лета
(10 гадзін, з іх 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Творы пра летнія змены ў прыродзе, працу і адпачынак летам.

Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Я добрую кнігу, як цуда, люблю».
М. Вышынскі. «Казачная царэўна».
А. Дзеружынскі. «Летняя раніца».
Н. Парукаў. «Ягады».
Ф. Рамашка. «Слёзы лілеі».
Клаўдзія Каліна. «Ліпень».

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

В. Жуковіч. «Маладая восень».
В. Лукша. «За што люблю я Новы год?».
Эдзі Агняцвет. «Маме».
Янка Купала. «Хлопчык і лётчык».
Якуб Колас. «Песня аб вясне».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Вучні павінны ведаць:

прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх неаднойчы сустракаліся на старонках падручніка, і іх творы (назва, імёны герояў, асноўны змест);

творы, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

правілы карыстання кнігамі, правілы гігіены чытання.

Мець першапачатковае ўяўленне:

пра творы вуснай народнай творчасці, іх жанры (прыказкі, скорагаворкі, загадкі, казкі, песні);

творы аўтарскай літаратуры (апавяданне, верш, казка, іх прыметы і адрозненні);

выяўленча-вобразныя сродкі мовы мастацкага твора (параўнанне, адушаўленне нежывой прыроды, эмацыянальна-ацэначныя словы, эпітэт);

сродкі выразнага чытання (сіла голасу, лагічны націск, лагічная паўза, інтанацыя сказа).

Умець:

чытаць цэлымі словамі ўслых і ў тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага; вызначаць з дапамогай настаўніка задачы выразнага чытання;

чытаць цэлымі словамі правільна з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай мовы: захоўваць арфаэпічныя нормы (вымаўленне гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], спалучэнняў [шч], [дз’], [дж], падоўжаных зычных);

выразна чытаць мастацкі твор з захаваннем інтанацыі сказа і паўз на знаках прыпынку (коска, працяжнік, двухкроп’е);

чытаць па ролях дыялогі герояў твора (пад кіраўніцтвам настаўніка);

правільна называць прачытаны твор, кнігу (прозвішча аўтара, назва, галоўны герой);

арыентавацца ў змесце твора да чытання (па назве і ілюстрацыях);

вылучаць у тэксце незразумелыя словы і выразы, вызначаць іх значэнне праз кантэкст і з дапамогай слоўніка або настаўніка;

вызначаць тэму і галоўную думку твора (з дапамогай настаўніка).

з дапамогай настаўніка вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай неабходна прачытаць;

планаваць дзейнасць: з дапамогай настаўніка называць у паслядоўнасці дзеянні пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразнага чытання;

складаць вусны разгорнуты адказ на пытанне настаўніка, пацвярджаць адказ урыўкам з тэксту;

знаходзіць у тэксце пачатак і канец урыўка, які праілюстраваны;

вылучаць дзейных асоб твора;

знаходзіць у тэксце эпізод з апісаннем учынку героя; выказваць свае адносіны да ўчынку героя;

падрабязна пераказваць невялікі твор (апавяданне апавядальнага характару, казку, сюжэтны верш) па гатовым плане, пытаннях настаўніка, апорных словах, ілюстрацыях;

адрозніваць народную казку ад аўтарскай, прыводзіць прыклады народных казак з кола вывучаных твораў і вылучаць іх асаблівасці;

арыентавацца ў кнізе: знаходзіць у змесце прозвішча аўтара, назву патрэбнага твора і адпаведную старонку;

выбіраць кнігу ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай (па тэме і жанры, аўтарскай прыналежнасці) з дапамогай бібліятэкара.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

выбіраць у бібліятэцы і чытаць кнігі, дзіцячую перыёдыку;

карыстацца відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі з прыцягненнем бібліятэкара;

самастойна знаёміцца з творамі і кнігай да пачатку чытання;

арыентавацца ў кнігах па змесце;

выказваць ацэначныя погляды аб прачытаным творы (героі, падзеі), кнізе, прагледжаным фільме, спектаклі;

знаходзіць у тлумачальным слоўніку значэнне невядомага слова;

прымаць удзел у літаратурных конкурсах.

Карыстацца набытымі ведамі і ўменнямі падчас выканання заданняў творчага характару:

ствараць ілюстрацыі да прачытанага твора, прыдумваць да іх подпісы, рабіць выставы ілюстрацый; пераказваць урывак з твора па ілюстрацыі;

выказваць сваё меркаванне аб прачытаным творы, герої і яго ўчынках, прыводзіць аргументы і доказы, абапіраючыся на змест прачытанага твора;

складаць цытатны план прачытанага твора і пераказваць яго ў адпаведнасці з планам;

складаць апавяданне або казку на пэўную тэму па плане і апорных словах, па дадзеным пачатку або канцоўцы; ствараць невялікія гісторыі з героямі прачытаных твораў;

сачыняць (па аналогіі з творамі фальклору) скорагаворкі, казкі;

выразна чытаць па ролях дыялогі літаратурных герояў або эпізоды казкі ці апавядання ў залежнасці ад эмацыянальнага стану героя і эмацыянальнага настрою твора;

інсцэніраваць нескладаныя сюжэтныя творы ці асобныя эпізоды з захаваннем мімікі, жэстаў, моўных асаблівасцей герояў; разыгрываць дыялогі з выражэннем настрою герояў;

удзельнічаць у конкурсных чытаннях вывучаных вершаў.

# ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IV КЛАСЕ

(175 гадзін, з іх 142 гадзіны – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 30 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў / 70 гадзін, з іх 57 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 10 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

## ЛІТАРАТУРНАЯ СКАРБОНКА

### Прыгожая птушка пер’ем, а чалавек вучэннем

(15 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Для чытання і вывучэння ў класе

Л. Арабей. «Новы сшытак».
Н. Галіноўская. «Дзень добры, школа!».
Н. Гілевіч. «Калі ранец лёгкі і калі цяжкі?».
М. Дукса. «Ці так чытала?».
В. Хомчанка. «Крыўда».
Прыказкі пра адносіны да вучэння.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Грамацеі», «Параска і падказка», «Свята кнігі».
Я. Бяганская. «Цяжкая задача».
М. Гіль. «Першы настаўнік».
А. Дзеружынскі. «Алё, Але», «Балбатуха Міла».
М. Дукса. «Скарга кнігі», «Хітры дзённік».
К. Жук. «Урок».
Янка Купала. «Юрачка».
У. Корбан. «Тры вучні».
В. Лукша. «Тэлефон».
М. Пазнякоў. «Мая бібліятэка».
П. Пранаўза. «Цяжкая дарожка».
А. Русак. «Мой сябра».
В. Хомчанка. «Коска».

У. Юрэвіч. «Караблік».
А. Якімовіч. «Аб чым спрачаліся кнігі?».

Увосень і верабей багаты
(16 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе
П. Броўка. «Надыход восені».
С. Грахоўскі. «Восень».
Р. Ігнаценка. «Лістападнік».
Якуб Колас. «Ясныя дні восені».
Янка Купала. «Лістапад».
П. Панчанка. «У грыбы».
Восеньскія песні.
Народныя загадкі пра восеньскія з’явы прыроды.

Для пазакласнага чытання
І. Багдановіч. «Восень».
А. Бутэвіч. «Прыгоды лісціка-карунчыка».
Васіль Вітка. «Лістапад».
Вера Вярба. «Гусі клічуць у вырай».
Н. Галіноўская. «Восень у лесе».
У. Дубоўка. «Залатая, асенняя раніца!», «Мядзведзь».
В. Жуковіч. «Адляцелі жураўлі».
Р. Ігнаценка. «Баравікі ў хусцінках».
Якуб Колас. «Восень».
П. Макаль. «Асенняе».
І. Навуменка. «Падранены журавель», «Пачыналася восень».
Я. Пушча. «Залатая пара».
Цётка. «Чаму птушкі адлятаюць».
Купальскія песні.

Чалавек без Радзімы, што салавей без песні
(18 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе
П. Броўка. «Песня хлебу».
У. Караткевіч. «Мая Беларусь».
У. Мяжэвіч. «Цяцерка».

М. Мятліцкі. «На мове роднай».

П. Панчанка. «Песня пра Мінск».

А. Русак. «Мой край».

Прыказкі пра адносіны да Радзімы.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Зямля з блакітнымі вачамі».

А. Бадак. «Маленькі чалавек у вялікім свеце».

Д. Бічэль. «Белая Русь».

П. Глебка. «О Беларусь, мая калыска...».

А. Дзеружынскі. «Я спяваю, ты спявай!», «Прамяніся ярчэй і ярчэй».

В. Жуковіч. «Няма даражэйшай зямлі», «Радзімаю нашай край гэты завецца…».

У. Караткевіч. «Родная зямля».

А. Карлюкевіч. «Рыбнае царства».

У. Карызна. «Наша Беларусь», «Роднае слова».

А. Клышка. «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга» («Зала сарака», «У слаўным горадзе Полацку»).

Якуб Колас. «Родныя вобразы».

Янка Купала. «Сын і маці».

У. Мазго. «Беларуска».

М. Пазнякоў. «У родным краі», «Родныя назвы».

А. Пісьмянкоў. «Цымбалы».

Я. Сіпакоў. «Першы астраном».

Максім Танк. «Лемантар».

Беларуская народная казка «Жаронцы».

Легенда «Адкуль пайшлі беларусы».

Паданне «Добры Жыцень».

Паданне пра Жыцень.

Добры чалавек і жывёлу шкадуе
(16 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Чаму ў трывозе Дзед Мароз?».

Н. Галіноўская. «Сябры прыроды».

А. Дзеружынскі. «Добрае сэрца».

Якуб Колас. «Ластаўкі».

А. Якімовіч. «Ножык».

Народныя загадкі пра жывёл.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Рэчка, рэчанька».

Л. Арабей. «Мікіткаў сон».

А. Асіпенка. «Прыгожая лісіца».

Змітрок Бядуля. «Скарб».

А. Васілевіч. «Пажар», «Калінавая рукавічка».

Г. Васілеўская. «Як кот грыбы збіраў».

М. Даніленка. «Журка».

А. Дзеружынскі. «Азбука птушак».

У. Дубоўка. «Шануйце ўсё жывое».

М. Дукса. «Сябры».

К. Жук. «Зямныя лекары».

В. Жуковіч. «Слухай родную прыроду».

Якуб Колас. «Савось-распуснік».

У. Мазго. «Лайдак і Шпак».

Г. Марчук. «Добрае сэрца», «Як Агапка мальвы ўратавала».

Р. Няхай. «Белая бярозка».

М. Пазнякоў. «Бярозка».

А. Пальчэўскі. «Верабейчык», «Крыўда», «Экзамен».

Я. Пархута. «І заяц стаў зайцам...», «Лесавічок» (Казка пятая. «Шалястунчыкі». Казка сёмая. «Пацерка». Казка адзінаццатая. «Сараканожка». Казка трынаццатая. «Ластаўчыны дзеткі»).

Г. Пашкоў. «Добрым будзь!».

З. Прыгодзіч. «Выратаванне ластаўкі».

Г. Пшонік. «Каштанчык».

А. Пысін. «Пісьмо птушак».

П. Рунец. «Ліпка».

І. Хадановіч. «Хто жыве на дне ракі?».

В. Хомчанка. «Дзядоўнік».

В. Шырко. «Дзіўны кот».

М. Янчанка. «Яблычак».

Легенды «Адкуль зязюля ўзялася», «Адкуль узяўся мядзведзь».

Зімовы дзянёк што камароў насок
(17 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Н. Гілевіч. «Снежны дзед».

В. Жуковіч. «Цудоўныя святы».

Якуб Колас. «Першы снег».
М. Маляўка. «Белыя ключы».
В. Хомчанка. «Елка з белымі кветкамі».
Калядныя песні.
Народныя прыкметы пра зіму.

Для пазакласнага чытання

Г. Аўласенка. «Хто як зімуе».
В. Дайліда. «Добрая фея».
М. Даніленка. «Ключы бабулі Зімы», «Зімовая азбука».
В. Жуковіч. «Старажытны звычай», «Зіма», «Першы снег», «Калі прыходзіць Дзед Мароз?».
Р. Ігнаценка. «Ягады пад снегам».
Клаўдзія Каліна. «Люты».
У. Карызна. «Гуканне Дзеда Мароза», «Навагодняя песенька».
Якуб Колас. «Дзед-госць».
Кандрат Крапіва. «З Новым годам».
П. Макаль. «Бялее снег пушысты».
У. Мацвеенка. «Ёлка-вясёлка».
А. Русак. «Сінічка».
А. Ставер. «Зіма».
М. Хведаровіч. «Ля хат высокія сумёты».
М. Чарняўскі. «Ёлка», «Ліса-калядоўшчыца».
Масленічныя песні.

Як ты да людзей, так і людзі да цябе
(18 гадзін, з іх 4 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Вельмі “ветлівы” Мікіта».
Л. Арабей. «Добрая фея».
У. Караткевіч. «Жабкі і Чарапаха».
Н. Мацяш. «Залатое сэрца».
П. Пранузa. «Сёння ў Толі выхадны».
М. Янчанка. «А таму!».
Прыказкі пра адносіны да людзей.

Для пазакласнага чытання

Г. Васілеўская. «Усмешка».
А. Дудараў. «Пухнацік».

Е. Лось. «Казка пра Ласку».

А. Масла. «Зорачка».

І. Муравейка. «Яблыкі для сястрычкі».

А. Пальчэўскі. «Добрае слова».

Т. Сівец. «Вандроўка на Паўночны полюс».

Д. Слаўковіч. «Віншаванне», «Селядцы на градзе».

М. Янчанка. «Адведалі».

Беларуская народная казка «Людзей слухай, а свой розум май».

А. Якімовіч. Казкі для дзяцей «Чаму звяры сталі вітацца?», «Дзень нараджэння», «Прабачце мне», «Пажаданні», «Словы ветлівасці».

Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае
(15 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін,
з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Г. Аўласенка. «Чыя мама лепшая?».

І. Муравейка. «Лыжкай па лбе».

І. Шамякін. «Пастух».

Беларуская народная казка «Зайздросны дзядзька».

Беларуская народная казка «Недалікатны сын».

Калыханкі, забаўлянкі, пацешкі, прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям’і.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Будзь верным, добрым сынам!».

Л. Арабей. «Мама».

Т. Бунта. «Далонькі з пушынкамі».

А. Васілевіч. «Мая гаспадарка», «Вернісаж».

П. Васючэнка. «Жаласлівая прынцэса».

Алесь Гарун. «Матчыны словы».

М. Даніленка. «Самыя дарагія падарункі».

У. Дубоўка. «Пра дзеда і ўнука».

М. Дукса. «Татава машына».

В. Жуковіч. «Дзіўны горад».

В. Зуёнак. «Смачны сон».

Я. Маўр. «Шчасце».

Л. Рублеўская. «Прыгоды мышкі Пік-Пік» («Як тата стаў суперменам», «Мышка Пік-Пік робіць сабе макіяж»).

В. Ткачоў. «Дарога».

І. Шамякін. «Хітрунна».

Беларускія народныя казкі «Стралец і рыбак», «Каток – залаты лабок».

Народныя забаўлянкі і лічылкі.

Вясенні дзень год корміць
(18 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 7 гадзін,
з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Багдановіч. «Перад паводкай».
У. Карызна. «Лісце прыляцела».
Якуб Колас. «Вясна».
М. Мятліцкі. «Пытанні».
А. Русак. «Мама».
Вясновыя песні.

Для пазакласнага чытання

А. Бачыла. «Мама».
А. Бялевіч. «Вясёлка над полем».
Зоська Верас. «Сонейка грэе».
Васіль Вітка. «Вялікдзень».
Я. Галубовіч. «Не пакінулі ў бядзе», «Салодкі кляновік», «Вясна».
М. Даніленка. «Голас вясны».
В. Жуковіч. «Гуканне вясны».
Клаўдзія Каліна. «Песня вясны».
А. Клышка. «Сыход зімы».
Якуб Колас. «Першы гром», «Краска».
Янка Купала. «Вясна».
М. Маляўка. «Вішнёвае воблачка».
І. Муравейка. «Страшны звер».
П. Пранузa. «Ручаёк».
Ю. Свірка. «Свята».
Максім Танк. «Галінка і вярбінка», «Ірынка», «Садзіце лясы!».
М. Хведаровіч. «Ластаўкі», «Пралескі», «Красавік».
К. Цвірка. «Коцікі».
Цётка. «Гутаркі аб птушках».

Хто хоча шчасліва жыць, той працу павінен любіць
(16 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 6 гадзін,
з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Буду настаўнікам».
М. Даніленка. «Маленькі фермер».
І. Аношкін. «Воля-кулінарка».
З. Марозаў. «Тата ў Ромы – аграном».
І. Муравейка. «Паўлік-будаўнік».
Беларуская народная казка «Лёгкі хлеб».
Прыказкі пра адносіны да працы.

Для пазакласнага чытання

А. Астрэйка. «Размова аб прафесіях».
Я. Бяганская. «Сланечнікі».
Васіль Вітка. «Хто што робіць».
В. Гардзей. «Мой тата – трактарыст».
С. Грахоўскі. «Касманаўты».
Х. Гурыновіч. «Маленькая даярка».
С. Дзяргай. «Зерне».
В. Жуковіч. «Выбіраю прафесію».
Х. Жычка. «Рэгуліроўшчык».
К. Камейша. «Ганчары».
К. Кірэенка. «Вучуся ў таты».
Янка Купала. «Сыны».
М. Маляўка. «Як дом будавалі».
М. Пазнякоў. «Побач з татам».
П. Пруднікаў. «Будаўнік».
Д. Слаўковіч. «Калі растуць агуркі».
Я. Хвалей. «Урок працы».
М. Чарняўскі. «Змайстравалі сані».

Мірна жыць – шчаслівым быць
(16 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў / 7 гадзін,
з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Даніленка. «Ордэн».

А. Махнач. «Юныя абаронцы».
І. Муравейка. «На вайне і не такое бывае» («Подзвіг ката Марціна»).
М. Пазнякоў. «Помнік герою».
Б. Сачанка. «Хлеб».

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Мой горад Мінск у час ваенны».
М. Гіль. «Партызанскі фотаздымак».
Л. Дайнека. «Прынясіце кветкі салдатам».
А. Дзеружынскі. «Крынічка партызанская».
А. Дудараў. «Буслы».
В. Жуковіч. «Бусел над Хатынню».
М. Маляўка. «Дзякуй за мір, Перамога!».
І. Муравейка. «На вайне і не такое бывае» («Адважны»).
І. Стадольнік. «Боты».

Хто спортам займаецца, той сілы набіраецца
(10 гадзін / 3 гадзіны)

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Маляўка. «Будзем біць рэкорды», «Велагонка».
Н. Гілевіч. «Сябры ў паходзе».
В. Шымук. «Канікулы».

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

Янка Купала. «Лістапад».
А. Русак. «Мой край».
Н. Галіноўская. «Сябры прыроды».
У. Карызна. «Лісце прыляцела».
Эдзі Агняцвет. «Буду настаўнікам».
М. Багдановіч. «Перад паводкай».
В. Шымук. «Канікулы».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Вучні павінны ведаць:

прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх неаднойчы сустракаліся на ўроках літаратурнага чытання, і іх творы (назва, імёны герояў, асноўны змест);

творы, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

правілы работы ў чытальнай зале бібліятэкі (школьнай або мясцовай).

Мець першапачатковае ўяўленне:

пра жанр як разнастайнасць літаратурных твораў;

жанравыя асаблівасці твораў фальклору: народнай песні, казкі, прыказкі;

жанравыя асаблівасці твораў аўтарскай літаратуры: літаратурнай казкі, апавядання, верша;

віды народных песень (восеньскія, калядныя, вяснянкі);

віды вершаў (вершы-апісанні, вершы-партрэты);

выяўленча-вобразныя сродкі мовы мастацкага твора (параўнанне, адушаўленне прадметаў, з’яў прыроды, эпітэт, эмацыянальна-ацэначныя словы);

навукова-пазнавальныя творы.

Умець:

чытаць правільна, усвядомлена і выразна ўслых цэлымі словамі тэксты розных відаў (мастацкі, навукова-пазнавальны, вучэбны) у адпаведнасці з арфаэпічнымі нормамі і ў тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага;

выразна чытаць падрыхтаваны мастацкі твор ці ўрывак з захаваннем інтанацыі сказа і паўз на знаках прыпынку ў адпаведнасці з эмацыянальным настроем твора, станам героя;

чытаць цэлымі словамі правільна, з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай мовы: захоўваць арфаэпічныя нормы (вымаўленне гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], спалучэнняў [шч], [дз’], [дж], падоўжаных зычных);

чытаць па ролях дыялогі герояў твора, асобныя эпізоды сюжэтных твораў (казка, апавяданне);

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

вызначаць вучэбную задачу чытання: з якой мэтай павінны прачытаць (з дапамогай настаўніка);

планаваць сваю дзейнасць: называць у паслядоўнасці дзеянні пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразнага чытання, слоўнага малявання (з дапамогай настаўніка);

кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і яе вынікам (самастойна ці з дапамогай настаўніка);

прагназаваць да чытання змест твора па ілюстрацыях і назве;

вылучаць у тэксце незразумелыя словы і выразы, вызначаць іх значэнне праз кантэкст, зноскі, з дапамогай слоўніка і глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт;

вызначаць тэму і галоўную думку твора (самастойна ці з дапамогай настаўніка);

знаходзіць у тэксце словы, якія ўказваюць на эмацыянальны настрой героя, яго пачуцці, адносіны аўтара да адлюстраваных з'яў (па прамым выказванні);

характарызаваць героя на падставе яго паводзін, перажыванняў і ўчынкаў, выказваць свае адносіны да яго;

выяўляць аўтарскі пункт погляду і выказваць свае думкі пра ўчынкі герояў, даваць сваю ацэнку ўчынку, герою;

ствараць слоўныя ілюстрацыі па змесце твора (слоўнае апісанне па ўяўленні героя твора, слоўнае апісанне па ўяўленні паэтычных карцін, эпізодаў тэксту);

працаваць з тэкстам: дзяліць на сэнсавыя часткі, складаць план, падрабязна і выбарачна пераказваць мастацкі твор па гатовым плане;

вылучаць у навукова-пазнавальным тэксце факты, дакладныя звесткі, знаходзіць апісанне прадмета, факта;

працаваць у групе, ствараючы інсцэніроўкі нескладаных сюжэтных твораў;

крытычна ацэньваць дзіцячыя творчыя работы падчас абмеркавання;

арыентавацца ў літаратурных тэрмінах і ўжываць іх да месца пры адказе на пытанне: фальклор, вусная народная творчасць, жанр, твор, празаік, паэт, эпізод, герой (персанаж), партрэт, характарыстыка, параўнанне, адухаўленне прадметаў, эпітэт, рыфма, навукова-пазнавальны тэкст, тытульны ліст, прадмова, змест, нумар часопіса, год выдання часопіса, экзэмпляр;

прыводзіць прыклады народных песень, казак (народных і літаратурных), вершаў, апавяданняў з кола твораў;

адрозніваць мастацкі і навукова-пазнавальны тэкст;

знаходзіць у бібліятэцы кнігі на зададзеную тэму, карыстаючыся рэкамендацыйнымі паказчыкамі, тэматычнымі выставамі або адкрытым доступам да кніжных паліц;

самастойна знаёміцца з творам і кнігай да чытання;

карыстацца даведачным апаратам падручніка.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

самастойна выбіраць і чытаць кнігі, дзіцячыя перыядычныя выданні;

карыстацца ўсімі відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі;

самастойна знаёміцца з творамі і кнігай да чытання;

арыентавацца ў кнігах па змесце;

выказваць ацэначныя погляды аб прачытаным творы (героі, падзеі), кнізе, прагледжаным фільме, спектаклі;

карыстацца тлумачальным слоўнікам;

прымаць удзел у літаратурных конкурсах.

Карыстацца набытымі ведамі і ўменнямі падчас выканання заданняў творчага характару:

ствараць ілюстрацыі да прачытанага твора, прыдумваць да іх подпісы, рабіць выставы ілюстрацый; пераказваць урывак з твора па ілюстрацыі;

выказваць сваё меркаванне аб прачытаным творы, героі і яго ўчынках, прыводзіць аргументы і доказы, абапіраючыся на змест прачытанага твора; прыдумваць уласную назву твора, параўноўваць з аўтарскай назвай, абгрунтоўваць свой выбар;

складаць план прачытанага твора і пераказваць яго ў адпаведнасці з планам;

складаць апавяданне або казку на пэўную тэму; ствараць невялікія гісторыі з героямі прачытаных твораў;

сачыняць (па аналогіі з творамі фальклору) скорагаворкі, казкі;

складаць апавяданне-апісанне па ілюстрацыях або карціне;

складаць творчы пераказ ад імя аднаго з герояў, з творчым дапаўненнем сюжэта;

выразна чытаць па ролях дыялогі літаратурных герояў або эпізоды казкі ці апавядання ў залежнасці ад эмацыянальнага стану героя і эмацыянальнага настрою твора;

інсцэніраваць невялікія па аб’ёме сюжэтныя творы ці асобныя эпізоды з захаваннем мімікі, жэстаў, моўных асаблівасцей герояў; разыгрываць дыялогі з выражэннем настрою герояў;

удзельнічаць у ранішніках, віктарынах, конкурсах чытальнікаў.

# ГЛАВА 5
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў V КЛАСЕ

(140 гадзін, з іх 114 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 23 гадзіны – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў / 70 гадзін**,** з іх 58 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

### ЛІТАРАТУРНАЯ СКАРБОНКА
Чалавек і прырода

(17 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Для чытання і вывучэння ў класе

В. Гардзей. «Жнівень».
І. Грамовіч. «Выпаў снег».
Р. Ігнаценка. «Бабіна лета».
Якуб Колас. «Усход сонца».
Г. Скаржынская-Савіцкая. «Чаму пралескі сінія».
Клаўдзія Каліна. «Буслы».
Народныя загадкі пра з’явы прыроды.

Для пазакласнага чытання

К. Буйло. «Мой Мурка», «У лесе».
А. Бутэвіч. «Як сасна з бярозай пасябравала».
С. Быкава. «Свавольніцы», «Заранка», «Гарэза-праменьчык».
Змітрок Бядуля. «Сняжыначкі-пушыначкі».
А. Васілевіч. «Геша».
Я. Галубовіч. «Забаўнае паляванне», «Сцяжынка», «Што аднаму цяжка, тое гуртам лёгка».
В. Гардзей. «Залаты лістапад».
Цішка Гартны. «Восень»
Н. Гілевіч. «Цуд тварыўся – я праспаў…», «Здарэнне ў лесе».
П. Глебка. «На пачатку лета».
У. Дубоўка. «Восень», «Раскрытая кніга», «Хто дужэйшы?».
В. Жуковіч. «Скалечаны голуб», «У зялёным лузе».

В. Кажура. «Пакацілася сонейка».
Клаўдзія Каліна. «Стракатая сойка».
А. Капусцін. «Казка старой сасны».
Якуб Колас. «Каля рэчкі», «Летам».
М. Корзун. «Міколкаў барометр».
Э. Луканскі. «Верабейка».
М. Лынькоў. «Ластаўчына талака».
В. Мыслівец. «Жураўлі і жураўка».
Г. Пашкоў. «Палессе», «Раніца ў пушчы», «У жытнім полі».
З. Прыгодзіч. «Джэк і Рыжык».
П. Ткачоў. «Тася».
К. Хадасевіч-Лісавая. «У кожнага свае справы».
І. Шамякін. «Воўк».

Чалавек і яго род
(14 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе
Н. Гілевіч. «Я – беларус».
А. Грачанікаў. «Бацькоўскі парог».
Б. Сачанка. «Адкуль пайшоў твой род?».
А. Карлюкевіч. «Вавёрка піша сачыненне».
Легенда «Палешукі і палевікі».

Для пазакласнага чытання
Эдзі Агняцвет. «Слова пра маці».
Л. Багдановіч. «Адзіная, як маці!».
В. Вітка. «Вавёрчына гора».
Янка Купала. «Над калыскай».
А. Ставер. «Унуку».
В. Шырко. «Дзед Манюкін не салжэ», «Дзед Манюкін і ўнукі».

Чалавек і Радзіма
(17 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе
П. Броўка. «Дарагая Беларусь».
К. Буйло. «Люблю».
Н. Гальпяровіч. «Бацька гарадоў беларускіх» (урывак).

У. Карызна. «Люблю цябе, Белая Русь».
А. Каско. «Горад з Белаю вежаю».
Я. Сіпакоў. «Любая мая Беларусь».

### Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Кліча вецер свежы».
А. Астрэйка. «Родная краіна».
А. Гурло. «Мой край».
В. Жуковіч. «Цудоўная краіна», «Беларус», «Няма даражэйшай зямлі», «Беларуская старонка», «Францішак Скарына».
А. Зэкаў. «Па-беларуску і па-руску», «Чатыры зярняткі».
У. Карызна. «Песня аб родным».
Я. Крупенька. «Два словы».
У. Мазго. «Мірскі замак».
М. Маляўка. «Полацк».
Г. Марчук. «Як Несцерка французаў перахітрыў».
М. Пазнякоў. «Адказ сыну», «Радзіма», «У бары», «Заўжды вярнуся».
А. Пісьмянкоў. «Мы – беларусы».
К. Цвірка. «Там яна».
В. Шпакевіч. «Мая зямля».

## Чалавек, слова і кніга
(14 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

С. Зелянко. Апавяданні з кнігі «Таямніцы беларускай мовы».
К. Цвірка. «У кнігарні».
Л. Дайнека. «Любіце мову».
А. Масла. «Як з’явіўся апостраф».
Прыказкі пра слова і кнігу.

### Для пазакласнага чытання

М. Арочка. «Цяжкае пытанне».
Л. Багдановіч. «Мы дзеці мовы беларускай».
П. Броўка. «Родныя словы».
Т. Бунта. «Добры дзень!».
В. Вітка. «Слова», «Шляхі-дарогі».
В. Жуковіч. «Кніга».
А. Зэкаў. «Дзве мовы».
А. Канапелька. «Роднае слова».

М. Пазнякоў. «Скарына».
П. Панчанка. «Хлебныя словы».
Г. Пашкоў. «Родная мова».
П. Прыходзька. «Твая мова».
Ю. Свірка. «Словы».
М. Чарняўскі. «Прыгода з Коскаю».

Чалавек і мастацтва
(14 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе
А. Грачанікаў. «Народ і песні».
М. Чарняўскі. «Слуцкія паясы».
Янка Купала. «Песня і казка».
Э. Валасевіч. «Шпачыны канфуз».
Легенда «Адкуль песня беларуская».
«Музыка-чарадзей» (беларуская народная казка).

Для пазакласнага чытання
Т. Бунта. «Урок музыкі».
Змітрок Бядуля. «Дудачка».
А. Дзеружынскі. «Наш беларускі ручнік».
Максім Танк. «Казка пра музыку».
У. Карызна. «Іграй, жалейка, не змаўкай…».
М. Чарняўскі. «Цымбалы».

Быць на зямлі чалавекам
(18 гадзін, з іх 5 гадзін – на пазакласнае чытанне / 9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе
Н. Гілевіч. «Калі рана ўстанеш».
В. Вітка. «Дзень нараджэння».
Н. Мацяш. «Калыханка маме».
В. Жуковіч. «Першая настаўніца».
П. Ткачоў. «Хітрун».
У. Правасуд. «Фанабэрысты Мухамор».
В. Гурскі. «Верныя сябры».
«Стары бацька» (беларуская народная казка).
Прыказкі пра дружбу.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Першае слова».

І. Аношкін. «Ленус-хранікалюс», «Дружная сямейка».

Р. Барадулін. «Грамат не хапіла».

Т. Бунта. «Дзіўная сінічка».

Я. Бяганская. «Антося».

Змітрок Бядуля. «Казка пра мядзведзя».

Э. Валасевіч. «Мітрафан і дэльтаплан», «Сама», «Арэхі і агрэхі», «Кот і вожык», «Арэх і жаба».

А. Васілевіч. «Маміна свята».

В. Вітка. «Самая дарагая рэч у нашым доме», «Добры знак».

Н. Галіноўская. «Фантазёр».

С. Гаўрусёў. «Пад апекаю бацькоў».

В. Жуковіч. «Трэба», «Свет – дзівосны».

Я. Мартыновіч. «Як сябры дапамаглі Пыху».

Г. Марчук. «Прыгоды дзяўчынкі Агапкі і ката Фокуса».

А. Масла. «Цудадзейныя лекі».

У. Корбан. «Казёл і Муха».

А. Крэйдзіч. «Сінічкі-міратворцы».

М. Пазнякоў. «Хітры Іванка», «Цукеркі».

У. Правасуд. «Вузел».

П. Рунец. «Аднойчы вечарам».

М. Скрыпка. «Індык», «Апанас», «Звяглівы Лыска».

Максім Танк. «Конь і леў», «Казка пра мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх».

М. Чарняўскі. «Чарадзейныя пруткі».

В. Шпакевіч. «Любіце родных».

Ф. Янкоўскі. «І за гарою пакланюся».

Чалавек і грамадства
(10 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання / 6 гадзін,
з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – кантроль навыку чытання)

Для чытання і вывучэння ў класе

У. Корбан. «Пчала і Ружа».

В. Шымук. «Лёгка нам нічога не даецца».

«Ад крадзенага не пасыцееш» (беларуская народная казка).

«Андрэй за ўсіх мудрэй» (беларуская народная казка).

Для пазакласнага чытання

Л. Багдановіч. «Праспалі свята».

А. Бадак. «Воўк і навука».

А. Бутэвіч. «Бунт у каралеўстве Віндаўса Вялікага».

С. Давідовіч. «Кемлівы Заяц!».

А. Зэкаў. «Чатыры зярняткі».

К. Ладуцька. «З Брэсцкай Тамашоўкі».

П. Місько. «Добры чалавек».

Г. Скаржынская-Савіцкая. «Прывід», «Перахітрыў».

Максім Танк. «Падарожжа мураша Бадзіні».

К. Хадасевіч-Лісавая. «Велапрабег з прыгодамі», «Ліст да Дзеда Мароза», «Чароўная ракавіна», «Вухуцік».

М. Чарняўскі. «Урок ветлівасці».

І. Шуцько. «Труцень і пчолкі».

Легенды «Золата ў прыполе», «Ліхая доля».

Чалавек на планеце Зямля
(14 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пазакласнае чытанне / 7 гадзін,
з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

П. Броўка. «А ты хоць дрэва пасадзіў?».

М. Пазнякоў. «Клён».

У. Правасуд. «Вадзянік і Лесавік».

Г. Пашкоў. «Выратаванне вожыка».

Я. Сіпакоў. «Беручы – аддаваць».

М. Даніленка. «Журка».

Для пазакласнага чытання

Н. Галіноўская. «Хата для шпакоў».

М. Гамолка. «Васілёва бярозка».

Н. Гілевіч. «Сіняя пушча».

Х. Гурыновіч. «Давайце пасадзім па дрэўцу», «Праталіны».

У. Правасуд. «Мядзведзевы забавы».

Я. Пушча. «Белавежа».

І. Шамякін. «Чорны прамень».

М. Янчанка. «Як я расой лячыўся».

Лёс чалавека на вайне
(12 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў / 6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

Для чытання і вывучэння ў класе

Я. Брыль. «Зялёная школа».
М. Чарняўскі. «Клятва Марата Казея».
М. Янчанка. «Сустрэча з бацькам».
П. Броўка. «А хіба ёсць, што забываюць?».

Для пазакласнага чытання

А. Астрэйка. «Плошча Перамогі».
А. Грачанікаў. «Каля помніка партызанскай славы “Прарыў”».
А. Куляшоў. «Над спаленай вёскай».
Я. Маўр. «Дом пры дарозе», «Завошта».
П. Панчанка. «Дзеці вайны».
І. Шамякін. «Алёша-разведчык».
Г. Шыловіч. «Была нядзеля…».
Апавяданні з кнігі «Ніколі не забудзем».

Чалавек, космас і Сусвет
(10 гадзін / 5 гадзін)

Для чытання і вывучэння ў класе

В. Жуковіч. «Хараство Сусвету».
П. Клімук. «На касмічным караблі».
К. Цвірка. «Да зорак».
А. Масла. «Калючык і космас».
У. Мазго. «Суседзі па Сусвеце».

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

Якуб Колас. «Усход сонца».
Н. Гілевіч. «Я – беларус».
У. Карызна. «Люблю цябе, Белая Русь».
В. Жуковіч. «Першая настаўніца».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ V КЛАСА

Вучні павінны ведаць:

прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх неаднойчы знаёміліся на ўроках літаратурнага чытання, і іх творы (назва, імёны герояў, асноўны змест);

творы, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

назвы элементаў кнігі: вокладка, пераплёт, карашок, старонка, тытульны ліст, змест, прадмова, ілюстрацыя.

Мець уяўленне:

пра жанр фальклору «легенда» і яе асаблівасці;

жанры аўтарскай літаратуры (літаратурная казка, апавяданне, байка, аповесць-казка, верш) і іх асаблівасці;

выяўленча-вобразныя сродкі мастацкага маўлення (параўнанне, адушаўленне, эпітэт, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы);

навукова-пазнавальныя творы.

Умець:

чытаць правільна, усвядомлена і выразна ўслых тэксты розных відаў (мастацкі, навукова-пазнавальны, вучэбны) у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення і ў тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага;

чытаць усвядомлена сам сабе (моўчкі) тэксты розных відаў;

самастойна вызначаць задачу выразнага чытання і чытаць выразна падрыхтаваныя тэксты;

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай павінны прачытаць;

планаваць дзейнасць: называць у паслядоўнасці дзеянні пры падрыхтоўцы да складання плана, сціслага пераказу, інсцэніроўкі;

кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і яе вынікам;

самастойна знаёміцца з творам і кнігай да чытання;

прагназаваць перад чытаннем змест і характар мастацкага твора (кнігі) па ілюстрацыях і загалоўку;

самастойна вызначаць тэму і галоўную думку твора;

самастойна знаходзіць у тэксце словы, якія ўказваюць на эмацыянальны настрой героя, яго пачуцці, адносіны аўтара да адлюстраваных з’яў;

характарызаваць героя на падставе яго паводзін, перажыванняў і ўчынкаў, выказваць свае адносіны да яго;

выяўляць аўтарскія адносіны і выказваць свае меркаванні пра падзеі, учынкі герояў; даваць сваю ацэнку ўчынку, герою;

складаць план твора і карыстацца ім падчас пераказу; падрабязна, выбарачна і сцісла пераказваць сюжэт твора;

вызначаць у тэксце твора выразныя сродкі мастацкага маўлення (параўнанне, адухаўленне, эпітэт, перабольшанне) і ўстанаўліваць іх функцыі, вызначаць рыфму і яе ўласцівасці;

вылучаць з навукова-пазнавальнага тэксту факты, дакладныя звесткі, знаходзіць апісанне прадмета, факта, ацэньваць інфармацыю (дзе можна выкарыстаць гэтыя веды);

ствараць слоўныя і графічныя ілюстрацыі па змесце твора;

арыентавацца ў літаратурных тэрмінах: жанр, мастацкі твор, навукова-пазнавальны тэкст, аўтар (пісьменнік, празаік, паэт), эпізод, тэма, асноўная думка, герой (персанаж), увасабленне, параўнанне, эпітэт, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы, рыфма; ужываць іх да месца пры адказе на пытанне;

прыводзіць прыклады легенд, песень, казак (народных і літаратурных), вершаў, апавяданняў, казачных аповесцей, навукова-пазнавальных тэкстаў з кола вывучаных твораў;

валодаць прыёмамі завучвання вершаў (з апорай на ключавыя словы і карціны, якія ўяўляюцца);

працаваць у групе, ствараючы інсцэніроўкі нескладаных сюжэтных твораў;

крытычна ацэньваць дзіцячыя творчыя работы падчас абмеркавання;

арыентавацца ў дзіцячых кнігах, выкарыстоўваючы пры гэтым адпаведныя элементы кнігі, а таксама бібліяграфічную дапамогу;

самастойна выконваць падбор кніг пэўнага аўтара або на зададзеную настаўнікам тэму;

карыстацца даведачнай літаратурай, а таксама матэрыяламі перыядычнага друку.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ажыццяўляць выбар кніг з дапамогай рэкамендавага спіса, адкрытага доступу да дзіцячых кніг у бібліятэцы;

самастойна чытаць кнігі, дзіцячую перыёдыку;

карыстацца ўсімі відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі;

самастойна знаёміцца з творамі і кнігай да чытання;

арыентавацца ў кнігах па змесце;

выказваць ацэначныя погляды аб прачытаным творы (героі, падзеі), кнізе, прагледжаным фільме, спектаклі;

карыстацца тлумачальным слоўнікам;

карыстацца энцыклапедычным тэкстам для атрымання фактычных даных;

прымаць удзел у літаратурных конкурсах.

Карыстацца набытымі ведамі і ўменнямі падчас выканання заданняў творчага характару:

ствараць ілюстрацыі да прачытанага твора, прыдумваць да іх подпісы, прымаць удзел у выставах ілюстрацый; пераказваць урывак з твора па ілюстрацыі;

выказваць сваё меркаванне аб прачытаным творы, герoі і яго ўчынках, прыводзіць аргументы і доказы, абапіраючыся на змест прачытанага твора; прыдумваць уласную назву твора, параўноўваць з аўтарскай назвай, абгрунтоўваць свой выбар;

складаць план прачытанага твора і пераказваць яго ў адпаведнасці з планам;

складаць апавяданне або казку на пэўную тэму; ствараць невялікія гісторыі з героямі прачытаных твораў; складаць з дапамогай настаўніка сцэнарый да мультфільма (з выкарыстаннем музычных твораў);

складаць апавяданне-апісанне, апавяданне-разважанне па ілюстрацыях або карціне;

сачыняць (па аналогіі з творамі фальклору) скорагаворкі, казкі, вершы;

складаць творчы пераказ ад імя аднаго з герояў з творчым дапаўненнем сюжэта;

выразна чытаць па ролях дыялогі літаратурных герояў або эпізоды твора ў залежнасці ад эмацыянальнага стану героя і эмацыянальнага настрою твора;

інсцэніраваць невялікія па аб’ёме сюжэтныя творы ці асобныя эпізоды з захаваннем мімікі, жэстаў, моўных асаблівасцей герояў; разыгрываць дыялогі з выражэннем настрою герояў;

рабіць «інтэрв’ю» з персанажам, які спадабаўся; рэпартаж з месца падзей;

ствараць сціслы водгук аб самастойна прачытаным творы па дадзеным узоры;

рыхтаваць творчы праект на зададзеную тэму (з дапамогай настаўніка);

ствараць дзённік летняга чытання;

удзельнічаць у тэматычных мерапрыемствах, віктарынах, конкурсах чытальнікаў.